**М. У. Аммон, В. А. Лідзянкова**
Філалагічны факультэт, факультэт замежных моў

# ДА ПЫТАННЯ МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНАСЦІ І СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Працэс адукацыі класічнага тыпу няспынна рухаецца па экспаненце, дзе ўніверсітэт – вяршыня гэтай лесвіцы. Аднак задача вышэйшай навучальнай установы не толькі паглыбляць веды, уменні і навыкі будучых спецыялістаў у профільнай сферы, але і пашырыць магчымы дыяпазон іх прымянення, падрыхтаваць творчую, мабільную асобу, здольную да хуткага самаразвіцця, перакваліфікацыі ў духу запатрабаванняў часу. Адным са шляхоў вырашэння пастаўленай задачы можа стаць арыентацыя на міждысцыплінарнасць, халістычны падыход да навукі і адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Безумоўна, дысцыплінарная глыбіня мае важнае значэнне ў працэсе прафесіянальнай падрыхтоўкі, але ва ўмовах сучаснага дынанічнага грамадства таксама актуальна наяўнасць у сучаснага чалавека, па словах псіхолага Г. Гарднера, “розума, які сінтэзуе” [1]. Менавіта таму

вялікім попытам на сённяшнім рынку працы карыстаюцца спецыялісты, якія могуць удзельнічаць у міждысцыплінарных праектах, як частка мнагапрофільных каманд або індывідуальна. Згаданы падыход садзейнічае выпрацоўцы максімальна поўнага разумення праблемы, а таксама метадалогіі яе вырашэння ў параўнанні з любым монадысцыплінарным пунктам гледжання.

У чым жа сутнасць міждысцыплінарнага падыходу? У падобным даследаванні студэнты вывучаюць і інтэгруюць асноўныя палажэнні з розных навук, субдысцыплін і абласцей ведаў. Акрэсленую стратэгію важна адрозніваць ад метадаў выкладання мульцідысцыплінарнага прадмета, які супастаўляе розныя пункты гледжання на тую ці іншую тэму без інтэграцыі. Міждысцыплінарнасць жа ўключае сінтэз або сінэргію розных пунктаў гледжання з мэтай садзейнічаць фарміраванню больш глыбокага разумення, збалансаванага меркавання, жыццяздольнага рашэння або прадукта, які творча прыстасоўваецца да розных пунктаў гледжання. М. Мілер і В. Мансіла называюць гэта распрацоўкай “міждысцыплінарнага разумення” [2].

Тым не менш, такое даследаванне – сапраўдны выклік сістэме адукацыі, які патрабуе выкарыстання новых падыходаў да арганізацыі, правядзення і ацэнкі работы, што абумоўлена, па словах С. Нікіцінай, наяўнасцю трох стратэгій міждысцыплінарнага навучання: “кантэкстуалізацыі, канцэптуалізацыі і метаду вырашэння праблемы” [3].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прывядзем прыклад прымянення першага падыходу ў межах макета 2 этапа міжфакультэцкага праекта “À la recherche du temps perdu: Беларусь і Еўропа ў кантэксце культурнага ўзаемадзеяння” (ERASMUS+ Jean Monnet Modules).

Праграма прадугледжвае супрацоўніцтва выкладчыкаў і студэнтаў філалагічнага факультэта і факультэта замежных моў, а таксама запрашэнне староніх экспертаў.

Галоўная мэта – сфарміраваць у студэнтаў комплексную і гатовую да выкарыстання мадэль разумення еўрапейска-беларускіх культурных ўзаемасувязей на сінхронным і дыяхронным узроўнях. Для дасягнення пастаўленай мэты сфармуляваны наступныя задачы:

– прасачыць спецыфіку ўзаемадзеяння еўрапейска-беларускіх культурных каштоўнасцяў ад эпохі старажытнасці да нашых дзён;

– выявіць асаблівасці і наступствы сітуацыі выпадзення Беларусі з еўрапейскага культурнага кантэксту;

– выпрацаваць метадалогію і стратэгію далейшых даследаванняў беларуска-еўрапейскіх культурных узаемадзеянняў;

– забяспечыць магчымасць атрымання будучымі спецыялістамі першага вопыту выкладання;

– падштурхнуць студэнтаў і маладых навукоўцаў да далейшых даследаванняў акэсленай праблематыкі і прымянення атрыманых вынікаў у сваёй прафесійнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці.

Мэтавыя групы: студэнты, магістранты, аспіранты, маладыя навукоўцы і ўсе зацікаўленыя ў пытаннях еўрапейска-беларускіх культурных адносінаў.

Асноўныя тэматычныя напрамкі даследавання:

– Постміфалагічная культура Еўропы ў кантэксце беларускіх пошукаў ідэнтычнасці.

– Беларуская культура і гісторыя сярэднявечнай Еўропы.

– Культура Беларусі ў эпоху еўрапейскага Адраджэння.

– Еўрапейскія Барока і Асветніцтва: беларускі ракурс.

– Гісторыя беларускай музычнай культуры праз прызму еўрапейскай: ад старажытнасці да канца XVIII ст.

– Еўрапейскія вытокі беларускага рамантызму.

– Беларусь без Еўропы: агляд культурнай сітуацыі выпадзення з кантэксту.

– Сучасная беларуская літаратура ў еўрапейскім кантэксце: формы, матывы, тэндэнцыі.

Запланаваныя аўдыторныя формы навучання:

1. Лекцыі па фундаментальных аспектах еўрапейскага і беларускага міжкультурнага дыялогу, большасць з якіх будзе размешчана ў сетцы Інтэрнэт у вольным доступе. Дадзены курс таксама прадугледжвае актыўны ўдзел будучых спецыялістаў у адукацыйным працэсе: асабліва зацікаўленыя аспіранты не толькі будуць слухачамі, але таксама паспрабуюць сябе ў ролі лектара, што будзе спрыяць атрыманню першы вопыта выкладання.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Акрамя традыцыйнай формы лекцыі, з мэтай правядзення комплекснага міждысцыплінарнага кампаратывістычнага даследавання мэтазгодны ўдзел некалькіх лектараў у межах адной тэмы. У такім выпадку запрошаны эксперт прадставіць дысцыплінарную экспертызу, а другі падсумуе гасцявую лекцыю і растлумачыць, як разнародныя факты і перспектывы могуць быць аб’яднаныя. Найбольш праблемныя тэмы могуць быць прадстаўлены таксама ў выглядзе інтэрв’ю экспертаў, дзе задача інтэрв’юера – паказаць, як розныя пункты гледжання могуць быць інтэграваны ў адзінае цэлае.

2. Семінары, праведзеныя практыкамі і знешнімі экспертамі па ключавых момантах курса.

3. Воркшоп “У пошуках страчанага часу: беларуская культура ў кантэксце еўрапейскай традыцыі”, мэтавая аўдыторыя якога – студэнты, аспіранты, маладыя даследчыкі спецыяльных і сумежных абласцей (літаратура, філасофія, гісторыя, мастацтва, архітэктура).

Гэты від работы з'яўляецца лагічным завяршэннем настаўніцкай дзейнасці і ставіць на мэту абагульніць атрыманую інфармацыю і даць магчымасць навучэнцам прадставіць сваё бачанне праблемы ў выглядзе справаздачы, кароткага рэферата, прэзентацыі і г. д. Аснову мерапрыемства складаюць праблемныя дыскусіі паміж дакладчыкамі і слухачамі, пры неабходнасці – сумесная праца аўтараў, а таксама круглы стол, падчас якога плануецца выпрацаваць агульную стратэгію для далейшых даследаванняў праблемы. Структура мерапрыемства:

*1 дзень: збор матэрыялаў, анамнез*

1.1 Даклады мясцовых і запрошаных дакладчыкаў аб развіцці беларускай культуры як часткі еўрапейскай гісторыі.

1.2 Індывідуальная праца, дыскусіі паміж аўтарамі, пры неабходнасці.

1.3 Круглы стол "Беларуская культура ў кантэксце еўрапейскай".

1.4 Кароткае падагульненне: праблемы і перспектывы тэмы.

*2 дзень: канцэптуалізацыя*

2.1 Даклады мясцовых і запрошаных дакладчыкаў па канцэптуальных пытаннях развіцця беларускай культуры ў кантэксце еўрапейскай (паняцце і межы культуры, праблема устаноў культуры, культурнай прасторы і тэрыторыі і г. д.).

2.2 Індывідуальная праца, дыскусіі паміж аўтарамі, пры неабходнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2.3 Круглы стол "Беларуская і еўрапейская культура: паралелі, мерыдыяны або агульная карта?"

2.4 Вынікі і планаванне далейшай работы.

У цэлым варта заўважыць, што прапанаванае міжфакультэцкае міждысцыплінарнае даследаванне будзе выдатным прэцэдэнтам для Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і іншых рэгіянальных і рэспубліканскіх вышэйшых навучальных устаноў у кантэксце перспектыў далейшага якаснага развіцця айчыннай сістэмы адукацыі. Акрамя таго, варта падкрэсліць відавочны выхаваўчы патэнцыял дадзенага праекту, бо ад комплекснага разумення гісторыка-сацыяльных, этыка-філасофскіх, мастацка-эстэтычных асноў беларускай культурнай прасторы залежыць далейшая паўнавартасная работа будучых спецыялістаў у галіне адукацыі, культуры і сродкаў масавай інфармацыі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1 Gardner, H. Five Minds for the Future / H. Gardner. – Boston: Harvard Business School Press, 2006. – 196 p.

2 Miller, M. Thinking Across Perspectives and Disciplines [Electronic resource] / M. Miller, V. Boix Mansilla // Interdisciplinary Studies Project.

Project Zero: Harvard Graduate School of Education, 2004. – Mode of access: http://citeseerx.ist.psu.edu/viewdoc/download?doi=10.1.1.85.7299&rep=rep1&type=pdf. – Date of access: 13.02.2018.

3 Nikitina, S. Three Strategies for Interdisciplinary Teaching: Contextualising, Conceptualising, and Problem-Solving [Electronic resource] / S. Nikitina // Interdisciplinary Studies Project. Project Zero: Harvard Graduate School of Education, 2002. – Mode of access: http://www.interdisciplinarystudiespz.org/pdf/Nikitina_Strategies_2002.pdf. – Date of access: 13.02.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ